# § 14. Эпоха Асветніцтва

**Успомніце.** *Для якой эпохі было характэрнае адраджэнне цікавасці да чалавека і зварот да спадчыны Антычнасці? Чаму ў пачатку Новага часу ўзмацнілася цікавасць чалавека да навакольнага свету?*

З канца XVII ст. вучоныя і філосафы намагаліся ўсё растлумачыць з пазіцый розуму і імкнуліся перабудаваць навакольны свет у адпаведнасці з навуковымі ведамі. Следам за навукоўцамі і звычайныя людзі настойліва спрабавалі паглыбіцца ў сутнасць таго, што адбывалася вакол іх у прыродзе і грамадстве. Невыпадкова XVIII ст. называюць стагоддзем Розуму, або Асветы.

**Вы даведаецеся.** *Што такое Асветніцтва. Асноўныя рысы і ідэі эпохі Асветніцтва. Хто былі першыя асветнікі. Якія іх тэорыі актуальныя і цяпер.*

**1. Што такое Асветніцтва?** ***Асветніцтва*** — гэта шырокі грамадскі і культурны рух, які атрымаў распаўсюджанне ў Заходняй Еўропе ў XVIII ст. Узнік ён на аснове дасягненняў эпохі гуманізму і Адраджэння. Удзельнікаў гэтага руху называюць асветнікамі.

Асветніцтва аказала велізарны ўплыў на ўсе бакі жыцця еўрапейскага грамадства. Зарадзілася яно ў Англіі ў канцы XVII ст. і хутка распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе, дасягнуўшы найвышэйшага росквіту ў Францыі і Германіі. У розных краінах гэты рух меў свае асаблівасці, але існавалі ідэі і паняцці, агульныя для ўсяго Асветніцтва.

Асаблівае значэнне еўрапейскія асветнікі надавалі паняццю «розум», які лічылі праявай чалавечай сутнасці. Выбітны нямецкі асветнік Імануіл Кант (1724—1804) падкрэсліваў важнасць розуму і незалежнасць чалавечай волі. Ён лічыў, што розум з'яўляецца крыніцай маралі і маральнасці. Да яго «голасу» трэба было прыслухоўвацца заўсёды і ва ўсім. З дапамогай розуму і навуковых ведаў асветнікі імкнуліся перабудаваць навакольны свет. Яны адмаўлялі царкоўнае вучэнне аб недасканаласці чалавечай прыроды. У гэтую эпоху людзі сталі верыць у творчыя сілы чалавека, у прагрэс, калі гісторыя рухаецца да лепшага,

развіваецца ад несправядлівага ўладкавання грамадства да справядлівага. Шмат каму здавалася, што асвета прывядзе чалавецтва да шчасця, што з дапамогай адукацыі можна перабудаваць грамадства на прынцыпах разумнасці і справядлівасці. Сваімі мэтамі асветнікі абвясцілі свабоду, дабрабыт і шчасце людзей, мір, ненасілле і верацярпімасць.

- Вера ў навуку
- Вера ў чалавечы розум
- Вырашальная роля адукацыі
- Крытыка тагачаснага ладу
- Роўнасць усіх перад законам
- Крытыка царквы

Асноўныя рысы эпохі Асветніцтва

*Пры дапамозе схемы і тэксту параграфа растлумачце асаблівасці эпохі Асветніцтва. Як вы думаеце, чаму ідэі Асветніцтва сталі асновай пазнейшых буржуазных рэвалюцый? Свой адказ аргументуйце.*

Асветнікі вылучылі ідэю натуральнага права. Лічылі, што ўсе людзі ад прыроды маюць роўныя правы. Адрозненні ў грамадстве ўстаноўлены не Богам, а людзьмі. Такім чынам, людзі могуць змяніць тое, што яны самі стварылі. Гэта была сапраўды рэвалюцыйная ідэя. Невыпадкова ідэі Асветніцтва сталі асновай буржуазных змен у грамадстве ў другой палове XVIII ст.

**2. Англійскае Асветніцтва.** Ля вытокаў еўрапейскага Асветніцтва стаяў англійскі мысляр Джон Лок (1632—1704). Ён адным з першых сфармуляваў новыя погляды на чалавека і грамадства, на дзяржаву і ўладу. Лок сцвярджаў, што ад прыроды ўсе людзі роўныя і адрозніваюцца толькі сваім разумовым развіццём. Грамадская няроўнасць тлумачыцца не тым, што ў кагосьці «блакітная кроў», а тым, што людзі нарадзіліся і атрымалі выхаванне ў розным сацыяльным асяроддзі: адны — у багатых сем’ях, другія — у бедных. У сувязі з гэтым Лок надаваў вялікае значэнне адукацыі і лічыў, што здабыццё ведаў робіць чалавека больш маральным і больш дасканалым. Дзяржава, паводле Лока, узнікла ў выніку дамоўленасці паміж людзьмі, каб ахоўваць свабоду, бяспеку і ўласнасць сваіх грамадзян.

133—134



Джон Лок. Мастак *Годфры Нелер.* 1697 г.

Калі ўрад уціскае грамадзян або не спраўляецца са сваімі абавязкамі, то грамадзяне маюць права перадаць уладу іншаму ўраду. Гэтая ідэя атрымала назву грамадскай дамовы.

Лок быў заснавальнікам вучэння пра падзел улад. Згодна з ім заканадаўчая ўлада, якая прымае законы, павінна належаць дэпутатам, якія выбіраюцца народам. Выканаўчая ўлада, якая праводзіць законы ў жыццё, даручаецца манарху і яго ўраду. Такім чынам, Лок быў прыхільнікам ***канстытуцыйнай манархіі***, гэта значыць такой формы кіравання, пры якой улада караля абмяжоўваецца ***канстытуцыяй***. Менавіта такая манархія ўсталявалася ў Англіі ў выніку рэвалюцыі XVII ст.



Шарль Луі Мантэск'ё. *Невядомы мастак.* 1728 г.

**3. Французскае Асветніцтва.** Французскае Асветніцтва, у адрозненне ад англійскага, характарызавалася бязлітаснай крытыкай царквы, старадаўніх звычаяў і абсалютнай манархіі. Выбітнымі французскімі асветнікамі былі Шарль Луі Мантэск'ё, Вальтэр і Жан-Жак Русо. Шарль Луі Мантэск'ё (1689—1755) развіў ідэі Лока, у прыватнасці тэорыю пра падзел улад. Згодна з ім заканадаўчая ўлада павінна належаць народу ў асобе абраных дэпутатаў-заканадаўцаў, выканаўчая — каралю і яго ўраду, а судовая — незалежнаму саслоўю суддзяў. Усе тры ўлады павінны быць незалежныя адна ад адной.



Вальтэр. Мастак *Нікала дэ Ларжыльер.* 1718 г.

***Вальтэр*** (сапраўднае імя — Франсуа Мары Аруэ; 1694—1778) быў самым знакамітым французскім асветнікам. Яго слава як драматурга, паэта, мысляра і гісторыка грымела па ўсёй Еўропе. Ліставацца з ім лічылі за гонар прускі кароль Фрыдрых II і расійская імператрыца Кацярына II. Знаёмства з ім настойліва шукалі і іншыя каралеўскія асобы Еўропы.

Вальтэр лічыў, што ў французскім грамадстве неабходна ажыццявіць рэформы: увесці свабоду слова і веравызнання, пераадолець рэлігійную нецярпімасць, даць роўныя правы ўсім людзям, незалежна ад саслоўнай прыналежнасці, знішчыць рэшткі залежнасці сялян. Вальтэр меркаваў, што такія рэформы можа правесці адукаваны манарх — «філосаф на троне». Як і іншыя асветнікі, Вальтэр лічыў недапушчальным і небяспечным умяшанне ў дзяржаўныя справы «неадукаваных» працоўных мас. Кіраваць грамадствам могуць толькі тыя, хто атрымаў веды.



Жан-Жак Русо. Мастак *Марыс Кантэн дэ Латур*. 1753 г.

Знакаміты французскі асветнік ***Жан-Жак Русо*** (1712—1778) лічыў, што адной роўнасці перад законам недастаткова — трэба ўраўнаваць маёмаснае становішча людзей. Русо быў перакананы, што крыніца ўсіх бед у грамадстве — прыватная ўласнасць. Усе войны і бедствы пачаліся з таго, што нехта калісьці ўпершыню сказаў, абгарадзіўшы ўчастак зямлі: «Гэта маё». Але Русо разумеў, што грамадства без прыватнай уласнасці ўжо немагчымае. Таму важна, каб у ім не было багацеяў і жабракоў. У адрозненне ад іншых французскіх асветнікаў Русо быў прыхільнікам рэспубліканскай формы кіравання.



Дэні Дзідро. Мастак *Луі Мішэль ван Лао*. 1767 г.

136—141

Вялікі ўплыў на грамадства аказалі так званыя энцыклапедысты — члены гуртка пісьменніка і філосафа-асветніка Дэні Дзідро (1713—1784). Дзідро быў перакананы, што веды з'яўляюцца сілай, з дапамогай якой можна палепшыць грамадства. Разам са сваімі сябрамі і аднадумцамі ён пачаў выдаваць знакамітую «Энцыклапедыю, або Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў». У ёй былі сабраны перадавыя навуковыя і тэхнічныя веды, якія спрыялі распаўсюджванню ідэй французскага Асветніцтва ў Еўропе.

**4. Асветны абсалютызм.** У справе пераўтварэння грамадства асветнікі ўскладалі вялікія надзеі на еўрапейскіх манархаў. Яны лічылі, што калі даць манархам адпаведную адукацыю, то такія адукаваныя ўладары будуць кіраваць у адпаведнасці з законамі і прынцыпамі розуму. Некаторыя асветнікі спрабавалі ўвасобіць свае ідэі на практыцы. Дзідро, напрыклад, сустракаўся і ліставаўся з расійскай імператрыцай Кацярынай II. А Вальтэр накіраваў будучаму прускаму каралю зварот «Наследнаму прынцу Прусіі пра карысць ведаў для гасудара».

Пад уплывам ідэй Асветніцтва ў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў сапраўды былі праведзены рэформы. Працягваючы захоўваць абсалютную ўладу, еўрапейскія манархі ажыццявілі некаторыя пераўтварэнні ў галіне эканомікі, палітыкі, права і культуры. Рэформы мелі на мэце мадэрнізацыю (абнаўленне) існуючага ладу і ліквідацыю феадальных перажыткаў. Такая палітыка атрымала назву асветнага абсалютызму.

*Як вы думаеце, ці няма ў словазлучэнні «асветны абсалютызм» супярэчнасці? Растлумачыць свой пункт гледжання.*

Яскравымі прыкладамі палітыкі асветнага абсалютызму былі рэформы Фрыдрыха II у Прусіі, Марыі Тэрэзіі і Іосіфа II у Аўстрыі, Кацярыны II у Расіі.



Філосафы за сталом Фрыдрыха II у Сан-Сусі (у ліку іншых — Вальтэр).
Мастак *Адольф фон Менцэль*. 1850 г.

*Як вы думаеце, чаму Фрыдрых Вялікі сабраў у сябе гэтых людзей? Якія пытанні, на ваш погляд, маглі яны абмяркоўваць? Чаму вы так думаеце?*

Фрыдрых II, напрыклад, не толькі пакінуў пасля сябе 30 тамоў філасофскіх, гістарычных і літаратурных твораў, але і адмяніў цэнзуру (кантроль за друкам), а таксама катаванні падчас судовых працэсаў. У Аўстрыі была ліквідаваная прыгонная залежнасць сялян, уводзілася бясплатная пачатковая адукацыя і адкрываліся семінарыі для падрыхтоўкі настаўнікаў, была абвешчана роўнасць усіх падданых перад судом і пры зборы падаткаў.

*Такім чынам, ідэі асветнікаў валодалі велізарнай прыцягальнай сілай. Нават еўрапейскія манархі знаходзіліся пад іх уплывам. Натуральна, асветны абсалютызм у адзін момант не мог прывесці да ліквідацыі феадальных парадкаў. У тую гістарычную эпоху гэта было магчыма толькі з дапамогай рэвалюцыі.*

***Ключавыя словы:*** *Асветніцтва, канстытуцыйная манархія, асветны абсалютызм, грамадская дамова, натуральныя правы, Джон Лок, Шарль Луі Мантэск'ё, Вальтэр, Жан-Жак Русо, Дэні Дзідро.*

**Пытанні і заданні**

**1.** Што такое Асветніцтва? Якія яго асноўныя ідэі?
**2.** Чаму эпоху Асветніцтва называюць «стагоддзе розуму»? Якое значэнне асветнікі надавалі чалавечаму розуму? Пра што гэта сведчыць?
**3.** У чым заключаецца сутнасць тэорыі грамадскай дамовы?
**4.** Якія натуральныя правы чалавека вы ведаеце?
**5.** Назавіце імёны манархаў-асветнікаў. Якім чынам яны спрабавалі ажыццявіць ідэі Асветніцтва ў сваіх дзяржавах?
**6.** Запоўніце ў сшытку табліцу «Асноўныя ідэі асветнікаў».

| Асветнік | Краіна | Асноўныя ідэі |
|---|---|---|
| | | |

Параўнайце ідэі асветнікаў. Па якіх пытаннях у іх былі падобныя меркаванні, а па якіх — адрозніваліся?
**7.** Якія сімвалы, на вашу думку, характэрныя для эпохі Асветніцтва? Складзіце «візітоўку» эпохі Асветніцтва, выкарыстоўваючы гэтыя сімвалы.